ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
16
ЛЮТАГА
ЧАЦВЕР
№ 5 (1418)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА



## КАНСТАНЦІН УСЦІНАВІЧ ЧАРНЕНКА

Канстанцін Усцінавіч Чарненка нарадзіўся 24 верасня 1911 года ў вёсцы Вялікая Цесь Навасёлаўскага раёна Краснаярскага краю, рускі.

Член КПСС з 1931 года. Адукацыя вышэйшая — закончыў педагагічны інстытут і вышэйшую школу партарганізатараў пры ЦК ВКП(б).

Працоўнае жыццё К. У. Чарненка пачаў з ранніх гадоў, працуючы па найму ў кулакоў. Уся яго далейшая працоўная дзейнасць звязана з кіруючай работай у камсамольскіх, а затым у партыйных органах. У 1929—1930 гадах К. У. Чарненка загадваў аддзелам прапаганды і агітацыі Навасёлаўскага райкома ВЛКСМ Краснаярскага краю. У 1930 годзе ён пайшоў добраахвотнікам у Чырвоную Армію. Да 1933 года служыў у пагранічных войсках, быў сакратаром партыйнай арганізацыі пагранічнай заставы.

Пасля заканчэння службы ў арміі К. У. Чарненка працаваў у Краснаярскім краі: загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі Навасёлаўскага і Уярскага райкомаў партыі, дырэктарам Краснаярскага краявога Дома партыйнай асветы, намеснікам загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі, сакратаром Краснаярскага крайкома партыі.

З 1943 года К. У. Чарненка вучыцца ў вышэйшай школе партарганізатараў пры ЦК ВКП(б). Пасля заканчэння вучобы з 1945 года працуе сакратаром Пензенскага абкома партыі. У 1948 годзе быў накіраван у Малдаўскую ССР і зацверджан загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі ЦК Кампартыі Малдавіі. Працуючы на гэтай пасадзе, ён многа сіл і ведаў аддаў эканамічнаму і культурнаму будаўніцтву ў рэспубліцы, камуністычнаму выхаванню працоўных.

У 1956 годзе К. У. Чарненка вылучаецца на работу ў апарат ЦК КПСС, дзе ён узначаліў сектар у Аддзеле прапаганды, і адначасова быў зацверджан членам рэдакцыйнай калегіі часопіса «Агитатор». З 1960 года ён працуе начальнікам Сакратарыята Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. У 1965 годзе К. У. Чарненка зацвярджаецца загадчыкам Агульнага аддзела ЦК КПСС. У 1966—1971 гадах ён — кандыдат у члены ЦК КПСС. На XXIV з'ездзе партыі (сакавік 1971 г.) выбіраецца членам Цэнтральнага Камітэта КПСС, а ў сакавіку 1976 года на Пленуме ЦК КПСС, які адбыўся пасля XXV з'езда партыі,—сакратаром ЦК КПСС.

З 1977 года ён — кандыдат у члены Палітбюро, а з 1978 года — член Палітбюро ЦК КПСС. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР 7—10-га скліканняў. Дэпутат Вярхоўнага Савета РСФСР 10-га склікання. К. У. Чарненка быў членам савецкай дэлегацыі на міжнароднай Нарадзе па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (Хельсінкі, 1975 год), удзельнічаў у перагаворах у Вене па пытаннях раззбраення (1979 год).

Канстанцін Усцінавіч Чарненка — вядомы дзеяч Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы. На ўсіх пасадах, якія даручала яму партыя, ён праявіў высокія арганізатарскія здольнасці, партыйную прынцыповасць, адданасць вялікай справе Леніна, ідэалам камунізму. К. У. Чарненка — аўтар рада навуковых прац па актуальных пытаннях павышэння кіруючай ролі партыі ў жыцці савецкага грамадства, удасканалення стылю і метадаў партыйнай і дзяржаўнай работы, развіцця сацыялістычнай дэмакратыі. На чэрвеньскім (1983 г.) Пленуме ЦК КПСС К. У. Чарненка выступіў з дакладам, у якім вызначаны галоўныя напрамкі паляпшэння ідэалагічнай дзейнасці КПСС у сучасных умовах.

За вялікія заслугі перад Радзімай Канстанцін Усцінавіч Чарненка двойчы ўдастоен звання Героя Сацыялістычнай Працы і ўзнагароджан трыма ордэнамі Леніна, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, многімі медалямі Савецкага Саюза. Ён з'яўляецца лаўрэатам Ленінскай прэміі.

К. У. Чарненка ўзнагароджан вышэйшымі ўзнагародамі сацыялістычных краін.

## ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

### аб Пленуме Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза

13 лютага 1984 года адбыўся нечарговы Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.

Па даручэнню Палітбюро ЦК Пленум адкрыў член Палітбюро, сакратар ЦК КПСС тав. К. У. Чарненка.

У сувязі са смерцю Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Ю. У. Андропава ўдзельнікі Пленума ЦК ушанавалі памяць Юрыя Уладзіміравіча Андропава мінутай журботнага маўчання.

Пленум ЦК адзначыў, што Камуністычная партыя Савецкага Саюза, увесь савецкі народ панеслі цяжкую страту. Не стала выдатнага дзеяча Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, палымянага патрыёта, ленінца, нястомнага змагара за мір і камунізм.

Знаходзячыся па волі партыі на важнейшых пасадах партыйнай і дзяржаўнай работы, Юрый Уладзіміравіч Андропаў аддаваў усе свае сілы, веды і велізарны жыццёвы вопыт ажыццяўленню палітыкі партыі, умацаванню яе сувязей з масамі, умацаванню эканамічнай і абароннай магутнасці Савецкага Саюза.

Шмат увагі ўдзяляў Ю. У. Андропаў правядзенню ў жыццё выпрацаванай XXVI з'ездам КПСС і наступнымі Пленумамі ЦК КПСС лініі на ўсямерную інтэнсіфікацыю вытворчасці, паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу, удасканаленне кіравання народнай гаспадаркай, узмацненне адказнасці кадраў, арганізаванасці і дысцыпліны, на няўхільны рост матэрыяльнага і духоўнага ўзроўню жыцця народа.

Вялікі ўклад унёс Ю. У. Андропаў у развіццё ўсебаковага супрацоўніцтва краін сацыялістычнай садружнасці, ва ўмацаванне адзінства і згуртаванасці міжнароднага камуністычнага і рабочага руху, у падтрымку справядлівай барацьбы народаў за сваю свабоду і незалежнасць. Пад яго кіраўніцтвам паслядоўна і настойліва ажыццяўляўся на міжнароднай арэне ленінскі знешнепалітычны курс нашай партыі і дзяржавы — курс на ліквідацыю пагрозы тэрмаядзернай вайны, на цвёрды адпор агрэсіўным падкопам імперыялізму, на ўмацаванне міру і бяспекі народаў.

Пленум падкрэсліў, што ў гэтыя журботныя дні камуністы, увесь савецкі народ яшчэ цясней згуртоўваюць свае рады вакол ленінскага Цэнтральнага Камітэта партыі, Палітбюро ЦК КПСС, поўныя рашучасці беззапаветна змагацца за ажыццяўленне ленінскай унутранай і знешняй палітыкі партыі.

Удзельнікі Пленума ЦК выказалі глыбокае спачуванне родным і блізкім памёршага.

Пленум ЦК разгледзеў пытанне аб выбранні Генеральнага сакратара ЦК КПСС.

Па даручэнню Палітбюро ЦК з прамовай па гэтаму пытанню выступіў член Палітбюро ЦК КПСС, Старшыня Савета Міністраў СССР тав. М. А. Ціханаў. Ён унёс прапанову выбраць Генеральным сакратаром ЦК КПСС тав. К. У. Чарненку.

Генеральным сакратаром Цэнтральнага Камітэта КПСС Пленум аднагалосна выбраў тав. Чарненку Канстанціна Усцінавіча.

Затым на Пленуме выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС тав. К. У. Чарненка. Ён выказаў сардэчную падзяку за высокае давер'е, аказанае яму Цэнтральным Камітэтам партыі.

Тав. К. У. Чарненка запэўніў Цэнтральны Камітэт КПСС, Камуністычную партыю, што прыкладзе ўсе свае сілы, веды і жыццёвы вопыт для паспяховага выканання задач камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне, забеспячэння пераемнасці ў вырашэнні пастаўленых XXVI з'ездам КПСС задач далейшага ўмацавання эканамічнай і абароннай магутнасці СССР, павышэння дабрабыту савецкага народа, умацавання міру, у ажыццяўленні ленінскай унутранай і знешняй палітыкі, якую праводзяць Камуністычная партыя і Савецкая дзяржава.

На гэтым Пленум ЦК закончыў сваю работу.



## Ад Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Савета Міністраў СССР

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР і Савет Міністраў СССР з глыбокім жалем паведамляюць партыі і ўсяму савецкаму народу, што 9 лютага 1984 года ў 16 гадзін 50 мінут пасля працяглай хваробы памёр Генеральны сакратар Цэнтральнага Камітэта КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Юрый Уладзіміравіч АНДРОПАЎ.

Імя Юрыя Уладзіміравіча Андропава — выдатнага дзеяча Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, стойкага барацьбіта за ідэалы камунізму, за мір — назаўсёды захаваецца ў сэрцах савецкіх людзей, усяго прагрэсіўнага чалавецтва.

## Пахаванне Юрыя Уладзіміравіча Андропава

### ЖАЛОБНЫ МІТЫНГ НА КРАСНАЙ ПЛОШЧЫ

**З пачуццём глыбокага смутку савецкі народ 14 лютага праводзіў у апошні шлях Юрыя Уладзіміравіча Андропава — выдатнага дзеяча Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, міжнароднага камуністычнага і рабочага руху, Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.**

**У журботным маўчанні за труной Ю. У. Андропава у жалобнай працэсіі ідуць кіраўнікі Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, члены камісіі па арганізацыі пахавання, родныя і блізкія памёршага, кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, адказныя работнікі ЦК КПСС, МГК КПСС і выканкома Массавета, прадстаўнікі грамадскасці.**

**Жалобны мітынг адкрыў Генеральны сакратар ЦК КПСС К. У. Чарненка.**

**Затым выступілі член Палітбюро ЦК КПСС, першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР, міністр замежных спраў СССР А. А. Грамыка, каваль-штампоўшчык маскоўскага аўтазавода імя І. А. Ліхачова Герой Сацыялістычнай Працы К. М. Малін, член Палітбюро ЦК КПСС, міністр абароны СССР Маршал Савецкага Саюза Д. Ф. Усцінаў, першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР Г. М. Маркаў, першы сакратар Карэльскага абкома КПСС І. І. Сенькін.**

**12 гадзін 45 мінут. Труну з целам памёршага апускаюць у магілу.**

**Краіна замерла ў жалобным смутку.**

**Светлы вобраз Юрыя Уладзіміравіча Андропава, які аддаў усе свае сілы справе партыі і народа, назаўсёды захаваецца ў сэрцах камуністаў, усіх савецкіх людзей.**

СЛОВА — ВЕТЭРАНУ

# „ГЕРОЕМ ПАВІНЕН КОЖНЫ БЫЦЬ“

**Подзвіг... Паняцце, якое мы звычайна ўкладваем у гэта слова, адназначнае. Часта ад маладых людзей прыходзіцца чуць шкадаванне аб тым, што прайшлі часы гераічных учынкаў, што не вернеш гады Ангеліных і Карчагіных, Матросавых і Гагарыных. «Ёсць месца подзвігу і ў сучасных умовах»—такой думкі прытрымліваецца Сцяпан Яфімавіч ЯНЧАНКА, прафесар, загадчык кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў, ветэран Вялікай Айчыннай вайны. «Савецкі народ упершыню ў гісторыі будуе новае, камуністычнае грамадства. Актыўны ўдзел у гэтай важнай справе—ужо подзвіг. Старацца і ўмець рабіць на карысць Радзіме, на карысць свайго народа больш, чым у сярэднім, ва ўсякую справу ўносіць сваю ініцыятыву, свой пачын— вось складаемыя подзвігу. Трэба мець на ўвазе і тое, што подзвіг — гэта не радавы, выпадковы ўчынак. Гэта вяршыня сістэмы ўчынкаў. Калі ж гэтай сістэмы не будзе, то не будзе на чым узвышацца і вяршыні. У. І. Ленін не выпадкова гаварыў аб будзённым гераізме як самым цяжкім, бо ён амаль не заўважаецца іншымі, успрымаецца як звычайная, паўсядзённая справа усіх і кожнага. Навучыцца плённа, умела, з радасцю, з песняй у душы рабіць даручаную справу, бадай, самае галоўнае. У гэтых умовах выяўляюцца сапраўдныя героі. Аб гэтым яскрава сведчаць словы з вядомай песні перадваеннага часу: «Когда страна быть прикажет героем, у нас героем становится любой».**

**— Сцяпан Яфімавіч, які эпізод з Вашай ваеннай біяграфіі запомніўся Вам на ўсё жыццё!**

— Вельмі цяжка коратка адказаць на гэта пытанне, бо было многа такіх эпізодаў, якія засталіся ў памяці на ўсё жыццё. Назваўшы адзін — прынізіш другі, тым больш, што кожны з іх неяк па-свойму свеціцца, бо кожны з іх сыграў адпаведную ролю ў гартаванні характару, волі, грамадзянскай сталасці, чалавечай годнасці ў такі цяжкі і складаны час, як вайна. Таму я назаву першы эпізод, памяць аб якім жыве са мною ўсё жыццё. 26 чэрвеня 1941 года здаў апошні экзамен у Віцебскім педвучылішчы. Згодна з размеркаваннем 8 ліпеня я павінен быў прыступіць да працы ў якасці выхавацеля Ляднянскага школьнага дзіцячага дома, які знаходзіўся ў мястэчку Ляды Дубровенскага раёна Смаленскай вобласці. Але... пачалася вайна. Негледзячы на ўсе цяжкасці ваеннага часу, на працу прыехаў я своечасова. Аднак працаваць прыйшлося нядоўга: усяго чатыры дні. 12 ліпеня за мной прыйшлі на кватэру і сказалі тэрмінова збірацца — эвакуацыя. Праз некалькі хвілін я быў ужо на месцы. Ля дзіцячага дома стаяла наша даваенная палутарка (газік). У кузаве сядзела маладая жанчына з хлапчуком школьнага ўзросту і невялікім клункам. У машыну пасадзілі 16 найбольш слабых выхаванцаў. На машыне я павінен быў давезці дзяцей да мястэчка Красны Смаленскай вобласці і там чакаць астатніх выхаванцаў дзіцячага дома разам з дырэктарам. Адтуль мы павінны былі сумесна рухацца на Смаленск. Але ні ў поўдзень, як абяцалі, ні нават увечары ніхто з застаўшыхся ў Лядах у Красны не прыбыў. Усе клопаты аб дзецях мне прыйшлося ўзяць на сябе. Нам нічога не заставалася, як, ужо пасля заходу сонца, ісці пешшу да Смаленска. А гэта 50 кіламетраў, на дарозе — ніводнай вёскі. А са мною хворыя, слабенькія дзеці... Цяжкасці шляху мы адчулі ўжо на першых кіламетрах. Не ведаю, як бы склаўся лёс нашага «падарожжа», калі б нас двойчы не падвезлі ішоўшыя ў напрамку Смаленска машыны. Першую машыну на адным з КПП павярнулі назад падабраць раненых пасля бою, другая везла раненых у Смаленск. Дзякуючы гэтаму мы праехалі праз усе КПП і ў гадзін 10 раніцы 13 ліпеня былі ў Смаленску. Смаленск стаавіўся прыфрантавым горадам, клопатаў у гарадскіх улад было вельмі многа. Але нам удалося атрымаць дапамогу — дзяцей накармілі ў сталовай аблвыканкома гарачым снеданнем. А гэта ўжо было няcase мала. Уладкаваць дзяцей у які-небудзь дзіцячы дом Смаленска не ўдалося. І мне прыйшлося вечарам 13 ліпеня на цягніку адправіцца ў глыбокі тыл. Двойчы адставаў ад эшалона — хадзіў за прадуктамі харчавання для дзяцей. У гэты час у Тамбоўскай вобласці быў адкрыты дзіцячы дом для эвакуіраваных дзяцей. Там знайшлі прытулак і 18 хлопчыкаў і дзяўчынак з Ляднянскага дзіцячага дома (двое выхаванцаў далучыліся да нас у Смаленску). Там і я працаваў выхавацелем да мая 1942 года.

У маі 1981 года, у час сустрэчы былых выхаванцаў Ляднянскага дзіцячага дома, мне стала вядома, што эвакуіраваліся ў тыл толькі тыя, хто быў разам са мной. Астатнія падышлі да мястэчка Красны, калі там ужо былі фашысты, і вымушаны былі вярнуцца назад у Ляды. Але там у час баёў будынак дзіцячага дома згарэў. Многія з выхаванцаў загінулі...

Вось вам першы эпізод, у якім я быў актыўным удзельнікам. Выраслі тыя дзеці, сталі бабулямі і дзядулямі. Але ў памяці гэты эпізод не згладзіўся. Яны вельмі ўдзячны роднай Савецкай дзяржаве за вялікія клопаты аб дзецях. Яны гэта адчулі на сабе. Ну а прадстаўніком Савецкай улады быў я.

**— Як склаўся далей Ваш лёс, Сцяпан Яфімавіч!**

— Уся мая дзейнасць у тыле ворага на працягу двух год праходзіла на тэрыторыі Беларусі ў Магілёўскай вобласці. Мусіць, на гэтай падставе можна лічыць сябе ўдзельнікам вызвалення Беларусі, хаця, шчыра кажучы, змагаючыся ў Беларусі ці ў Ленінградскай вобласці, на акупіраванай тэрыторыі наогул, партызаны стварылі сапраўдны «другі фронт» супраць фашысцкай арміі і вельмі садзейнічалі вызваленню ўсёй часова акупіраванай тэрыторыі Савецкага Саюза. Думаю, што ў мяне, як і ва ўсіх удзельнікаў барацьбы ў тыле ворага, самымі памятнымі былі падзеі, звязаныя з разгромам нямецка-фашысцкіх войск у Беларусі, падзеі чэрвеня—ліпеня 1944 года. Напярэдадні Беларускай наступальнай аперацыі Чырвонай Арміі ўсе народныя мсціўцы па загаду штаба партызанскага руху пачалі аперацыю на чыгунцы. Фашысцкія войскі не змаглі выкарыстаць чыгунку ў самы неабходны для іх час, калі пачалося магутнае наступленне нашых войск. Неўзабаве пасля гэтага «канцэрта». мы з радасцю, хваляваннем і гонарам сустрэліся з Чырвонай Арміяй, якая рухалася далей на захад. Думаю, што ў поспеху аперацыі «Баграціён» ёсць важкі уклад і ўсіх партызан Беларусі.

Моладзь 20-х, моладзь 40-х — пакаленні суровых гадоў. Сённяшняя моладзь цалкам наследуе карчагінскі энтузіязм, полымя матросаўскага сэрца, ангелінскую энергію, гагарынскую адвагу.

Нішто так не дапамагае выхаванню адказнасці, як даручэнне маладым людзям самых сур'ёзных спраў, рашэнне тых задач, якія стаяць перад краінай, народам. На выкананні такіх даручэнняў расце і загартоўваецца малады чалавек. Вось, напрыклад, мне і многім маім паплечнікам даручалі складаныя і адказныя заданні ў тыле ворага. Вопыт набывалі ў адчайнай барацьбе, вельмі часта рызыкуючы ўласным жыццём. Між іншым, мне здаецца, мы штучна затрымліваем рост і ўзмужненне маладых людзей. Нават у студэнцкія групы другіх — пятых курсаў універсітэта пасылаем «класных дам» пры выездзе на сельскагаспадарчыя работы ў якасці кіраўніка групы. Няўжо сярод 20—25-гадовых юнакоў і дзяўчат няма каму даручыць такую справу? У студэнцкіх жа будаўнічых атрадах знаходзяцца ўдзельнікі, якія ўдала працуюць камандзірамі і камісарамі. Альбо ўдзел у агітацыйна-масавай кампаніі ў сувязі з выбарамі ці іншай палітычнай падзеяй. На маю думку, тут камсамол універсітэта яўна ўпускае магчымасці для выхавання адказнасці ў многіх сваіх членаў.

Вельмі хацелася б пажадаць сваім маладым таварышам поспехаў у дасягненні намечаных мэт, быць карыснымі грамадству, людзям, а таксама і тым, хто блізка, побач. Іменна ў гэтым сапраўднае чалавечае шчасце. Яно ў барацьбе за новыя поспехі ў імя Радзімы.

**Запісала**
**А. МАТУСЕВІЧ.**

# САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ КАЛЕКТЫВУ

## *Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна на 1984 год*

АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЧЫ рашэнні XXVI з'езда КПСС, Пленумаў ЦК КПСС, калектыў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна шырока разгарнуў сацыялістычныя спаборніцтвы за выкананне планаў, прынятых сацыялістычных абавязацельстваў і далейшае якаснае паляпшэнне ўсёй работы.

Выкладчыкі, студэнты, навуковыя супрацоўнікі, рабочыя і служачыя універсітэта аднадушна адабраюць унутраную і знешнюю палітыку нашай партыі, яе нястомны клопат аб усебаковым развіцці і ўмацаванні Савецкай дзяржавы, рыхтуюцца да дастойнай сустрэчы знамянальнай падзеі — 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Зыходзячы з рашэнняў XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда КПБ, калектыў універсітэта накіроўвае свае намаганні на:

— павышэнне якасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, здольных вырашаць праблемы паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу і павелічэнне укладу Белдзяржуніверсітэта ў развіццё народнай адукацыі рэспублікі ў святле патрабаванняў, якія вынікаюць з праекта ЦК КПСС «Асноўныя напрамкі рэформы агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы»;

— забеспячэнне далейшага развіцця фундаментальных і прыкладных даследаванняў у галіне грамадскіх, прыродазнаўчых і гуманітарных навук;

— удасканаленне вучэбна-метадычнай работы, укараненне навуковых прынцыпаў арганізацыі вучэбнага працэсу, выкарыстанне ў ім навейшых дасягненняў, тэхнічных сродкаў навучання і вылічальнай тэхнікі;

— удасканаленне форм і метадаў камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі;

— далейшае ўмацаванне працоўнай дысцыпліны, парадку і арганізаванасці, выхаванне адказнасці кадраў за даручаную справу;

— далейшае развіццё сацыялістычнага спаборніцтва ў святле патрабаванняў пастановы ЦК КПСС «Аб удасканаленні арганізацыі, практыкі падвядзення вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва і заахвочвання яго пераможцаў».

Удзельнічаючы ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве, калектыў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна прымае на 1984 год наступныя сацыялістычныя абавязацельствы:

1. Выканаць планы прыёму і выпуску спецыялістаў па дзённай, вячэрняй і завочнай формах навучання і па аспірантуры.

2. Абараніць 8 доктарскіх і не менш чым 80 кандыдацкіх дысертацый.

3. Падрыхтаваць да выдання і выдаць не менш чым 20 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў і 200 метадычных распрацовак.

4. Дабіцца, каб колькасць дыпломных работ студэнтаў дзённай формы навучання, рэкамендаваных да ўкаранення ці друку, склала не менш як 30 працэнтаў.

5. Выканаць НДР на агульную суму не менш як 12,5 млн. руб. Атрымаць эканамічны эфект ад укаранення закончаных НДР не менш чым на 15 млн. руб.

6. Арганізаваць і правесці 2 усесаюзныя і 14 універсітэцкіх навуковых і навукова-метадычных канферэнцый.

7. Прадоўжыць распрацоўку 14 навуковых тэм, звязаных з рэалізацыяй Харчовай праграмы СССР. Сіламі студэнтаў і супрацоўнікаў адпрацаваць у калгасах і саўгасах рэспублікі не менш як 100 тыс. чалавека-дзён, у тым ліку ў падшэфным саўгасе «Гарадок».

8. Прадставіць у Дзяржкамітэт па адкрыццях і вынаходніцтвах не менш як 390 заявак і атрымаць на раней пададзеныя заяўкі не менш як 195 станоўчых рашэнняў.

9. Прадставіць на Усесаюзны і рэспубліканскі конкурсы не менш як 310 студэнцкіх навуковых работ.

10. Падрыхтаваць да друку не менш як 220 артыкулаў у сааўтарстве са студэнтамі.

11. Падрыхтаваць не менш як 3000 дакладаў студэнтаў на навуковых канферэнцыях.

12. Забяспечыць падрыхтоўку на ФГП не менш як 2000 студэнтаў.

13. Сфарміраваць зводны студэнцкі будаўнічы атрад колькасцю не менш як 2400 чалавек. Асвоіць сіламі зводнага студэнцкага атрада не менш як 3 млн. рублёў капіталаўкладанняў.

14. Арганізаваць і правесці 25 паходаў моладзі, выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў па месцах баявой і працоўнай славы савецкага народа з удзелам у іх не менш як 500 чалавек.

15. Прачытаць для насельніцтва 8500 лекцый на агульнапалітычныя і навуковыя тэмы.

16. Падрыхтаваць 6 майстроў спорту, 19 кандыдатаў у майстры спорту, не менш як 80 спартсменаў I разраду і не менш як 4500 спартсменаў масавых разрадаў.

17. Падрыхтаваць не менш як 2300 значкістаў комплексу ГПА.

18. Выканаць наменклатурныя мерапрыемствы па ахове працы на суму не менш як 30 тыс. рублёў.

19. Сэканоміць 150 тыс. кілават-гадзін электраэнергіі.

20. Адкрыць піянерскі універсітэцкі лагер на 160 месц у змену.

21. Арганізаваць калектыўнае таварыства садаводаў на 150 сем'яў супрацоўнікаў.

**Сацыялістычныя абавязацельствы абмеркаваны і прыняты на сходзе партыйна-гаспадарчага актыву універсітэта 30 студзеня 1984 года.**

# ВЫНІКІ

## САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА

## факультэтаў БДУ імя У. І. Леніна за 1981—1983 гады

| Факультэты | а 1981 | а 1982 | а 1983 | б 1981 | б 1982 | б 1983 | в 1981 | в 1982 | в 1983 | г 1981 | г 1982 | г 1983 | д 1981 | д 1982 | д 1983 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Фізічны | 6—8 | 5 | 9 | 3 | 2 | 10 | 1 | 1 | 2 | 2 | 5 | 2 | 1 | 1 | 5—6 |
| Радыёфізікі і электронікі | 6—8 | 10 | 4 | 1 | 3 | 2 | 2 | 3 | 1 | 5 | 6 | 1 | 2 | — | 1 |
| Хімічны | 2 | 11 | 11 | 4 | 1 | 4 | 4 | 4 | 3 | 6 | 9 | 5 | 3 | 5 | 5—6 |
| Механіка-матэматычны | 9 | 7 | 1 | 10 | 6 | 7 | 10 | 6 | 7 | 1 | 1 | 3 | 10 | 3 | 3 |
| Прыкладной матэматыкі | 5 | 2 | 7 | 5 | 5 | 5 | 6 | 7 | 6 | 10 | 4 | 4 | 6—7 | 2 | 4 |
| Біялагічны | 6—8 | 8 | 8 | 2 | 11 | 6 | 5 | 2 | 4 | 11 | 10 | 8 | 4 | 7 | 7 |
| Геаграфічны | 10 | 9 | 10 | 7 | 8 | 9 | 3 | 9—10 | 5 | 7 | 11 | 10 | 8 | 10 | 10 |
| Гістарычны | 3 | 4 | 6 | 9 | 10 | 3 | 9 | 5 | 9 | 3 | 3 | 9 | 5 | 4 | 8 |
| Журналістыкі | 4 | 3 | 3 | 8 | 7 | 11 | 8 | 8 | 11 | 9 | 8 | 11 | 9 | 8 | 11 |
| Юрыдычны | 11 | 6 | 2 | 11 | 9 | 1 | 11 | 11 | 8 | 4 | 2 | 6 | 11 | 9 | 2 |
| Філалагічны | 1 | 1 | 5 | 6 | 4 | 8 | 7 | 9—10 | 10 | 8 | 7 | 7 | 6—7 | 6 | 9 |

**ЗАЎВАГА:** лічбы—месцы, занятыя факультэтамі па раздзелах; а — падрыхтоўка навукова-педагагічных кадраў, павышэнне кваліфікацыі; б — навукова-метадычная, вучэбна-метадычная работа; в—навукова-даследчая работа; г—грамадска-палітычная і арганізацыйна-масавая работа; д—выніковыя месцы.

● ТВОРЧАСЦЬ НАШЫХ ЧЫТАЧОЎ ●

## МЕРЫДЫЯНАМІ ДРУЖБЫ

**Агульнавядомы багатыя традыцыі цудоўнага пісьменства Грузіі. Студэнт 3 курса філалагічнага факультэта Уладзімір СІЎЧЫКАЎ, які стажыруецца ў Тбіліскім універсітэце, прапануе чытачам свае новыя пераклады з грузінскай мовы.**

НА ПАЛІТРЫ ТБІЛІСІ восенню панавалі тры колеры: стрыманая чырвань дахаў старых кварталаў, залацістая вохра платанаў і таполяў, а жаўтавата-шэры, апалавы колер пераглядваў бясконцымі адценнямі на камяніцы храма Метэхі, на бруку вулак і нават у павольных водах Куры. Велічна застыў на высокім пастаменце бронзавы коннік (помнік заснавальніку горада Вахтангу Гаргасалу), паглыбіліся ва ўспаміны рэшткі старажытнай крэпасці Нарыкала, ззяе купаламі пантэон на гары Мцацміндзе, што даў апошні прытулак найбольш славутым сынам Іверыі.

Такой запомнілася мне грузінская сталіца.

Самабытная гісторыя, багатая літаратура, першы вядомы пісьмовы помнік якой датуецца аж 5 стагоддзем н. э., надзвычай цікавілі мяне, студэнта-філолага. Па дамоўленасці аб падрыхтоўцы спецыялістаў, якая існуе паміж Тбіліскім і Беларускім дзяржаўнымі універсітэтамі, я паехаў вывучаць грузінскую мову і літаратуру. Дарэчы, грузіны, якія вывучалі беларускую мову і стажыраваліся ў Мінску, працуюць на радзіме ў Музеі дружбы народаў.

У Грузіі шмат намаганняў прыкладаюць для папулярызацыі дасягненняў нацыянальнай літаратуры. Нямала для гэтага робяць Саюз пісьменнікаў рэспублікі, калегія па мастацкаму перакладу, універсітэт. У Тбіліскім універсітэце імя Ш. Руставелі працуе кафедра літаратур народаў СССР, літаратурных узаемасувязей і мастацкага перакладу, якую ўзначальвае прафесар А. А. Бакалзе. Тут падрыхтаваны дзесяткі вучоных-літаратуразнаўцаў і майстроў мастацкага перакладу не толькі з саюзных рэспублік, але і з замежных краін.

Асабліва цікава праходзяць заняткі на перакладчыцкім аддзяленні. Акрамя агульнафілалагічных дысцыплін, чытаюцца лекцыі па тэорыі і гісторыі перакладу, супастаўляльнай стылістыцы і іншыя. Спецсемінары і практычныя заняткі часта выліваюцца ў гарачыя творчыя дыскусіі.

Мне здаецца, што і ў нас, ва універсітэце, даўно ўжо наспела патрэба рыхтаваць спецыялістаў па мастацкаму перакладу.

У Тбіліскім універсітэце стала даўно добрай традыцыяй у сярэдзіне снежня адзначаць дзень філолага. На паэтычным вечары студэнты і вядомыя літаратары чытаюць свае новыя творы і пераклады, дзеляцца планамі. Мэтанакіраваная праца дае багаты плён. У мінулым годзе ва універсітэцкім выдавецтве выйшаў зборнік беларускай паэзіі «Шчаслівы дзень», дзе паралельна з арыгіналам даецца грузінскі пераклад.

Хачу адзначыць, што і мы, беларусы, не застаёмся ў даўгу. Рэспубліканскае выдавецтва «Мастацкая літаратура» рыхтуе двухтомную анталогію грузінскай паэзіі. Прапануем увазе чытачоў новыя пераклады, некаторыя з якіх паявяцца на старонках анталогіі.

**У. СІЎЧЫКАЎ,**
**студэнт філалагічнага факультэта.**

**Галакціён ТАБІДЗЕ**

### РАНАК СОРАК ШОСТАГА

Новы год прыйшоў
імгненнем новым —
Ранак сорак шостага настаў.
Сорак пяты — дату памылкова
Я пад новым вершам напісаў.
І не толькі ў звыклым руху
справа:
Зведаўшы аповесць дзіўных
дзён,
Сімвалам расплаты, вечнай
славы
Застанецца ў летапісе ён.

**Шалва АМІСУЛАШВІЛІ**

### ДАРУНАК

Сустракаю без крыўды я
старасць
І скажу на адметнай мяжы:
«Па душы шэсць дзесяткаў,
нібыта
Строй палос, як і ў тыгра,
блішчыць».
Свой у старасці погляд
на рэчы,
Заваёвы і свят капяжы,
Атрымаў неацэнны дарунак,
Дык нашто сумаваць і тужыць?

**Нугзар КАБЕРЫДЗЕ**

* * *

Жнівень, ліловa-чорная смоква
спее.
Быццам арэх з лупіны,
вылузваецца сонца...
Юнакі ледзьве пераводзяць
дух,
Калі міма праплывае твая
белая сукенка.
Жнівень, ліловa-чорная смоква
спее...

● ПРАДСТАЎЛЯЕМ УДЗЕЛЬНІКАЎ ФОТАКОНКУРСУ ●

**Ігар БЫШНЕЎ:**

## *«ВЫБІРАЮ ФОТАПАЛЯВАННЕ»*

ФОТАПАЛЯВАННЕ. Прачытаеш гэта слова, і адразу ўяўляюцца стары, зарослы мохам яловы лес або ціхі ранішні досвітак на беразе возера, роўненькая лыжня на бялюткім снезе... Колькі прыгожага, незвычайнага і таямнічага адкрывае яно таму, хто па-сапраўднаму бярэцца за фотаружжо, хто аддае свой вольны час вандроўкам па лясах, рэчках, балотах, азёрах. Прырода адкрываецца толькі самым настойлівым, цярплівым, уважлівым. Цяжка, ой як цяжка бывае ціхенька падкрасціся да вывадка качак, чарады дзікоў або да звычайнай, але, як і ўсе жывыя істоты, асцярожнай сінічкі. Затое колькі радасці прыносіць атрыманы фотаздымак! Магчыма, нават больш, чым у сапраўднага паляўнічага пасля ўдалага палявання. Бо стрэл з фотаружжа не абрывае жыццё жывёлы, птушкі, не ператварае грацыёзную жывую істоту ў акрываўлены камяк мяса. Бо стрэл з фотаружжа прыносіць асалоду не толькі самому фотааматару, але і ўсім тым, хто знаёміцца з яго «трафеямі».

**С. ПЛЫТКЕВІЧ,**
**фотакарэспандэнт газеты «Беларускі універсітэт».**

**НА ЗДЫМКАХ:** чацвёртакурснік біялагічнага факультэта Ігар Бышнеў; апошнія фотаўдачы аматара фотапалявання.









**Сёння ў нашай газеце прэм'ера рубрыкі «Спартыўныя гарызонты». Пад ёю будуць выступаць карэспандэнты газеты, трэнеры каманд, выкладчыкі фізвыхавання, спартсмены. Яны раскажуць аб развіцці асобных відаў спорту ва універсітэце, наспеўшых праблемах, шляхах іх вырашэння. Адкрываецца рубрыка гутаркай нашага карэспандэнта Уладзіміра Абрамовіча і старшага выкладчыка кафедры фізвыхавання і спорту, трэнера зборных каманд універсітэта па баскетболу Віталія Ярвандавіча Шхіньяна.**

# КАЛІ ВЫКАРЫСТАЦЬ УСЕ РЭЗЕРВЫ

## ● СПАРТЫЎНЫЯ ГАРЫЗОНТЫ ●

**— На першынстве універсітэта па баскетболу, якое завяршылася ў студзені, за каманды факультэтаў выступалі Савіцкая, Дадычына, Рубан, Сяверчанка, Дамарацкая... Некаторыя гледачы спецыяльна прыходзілі на матчы, каб паглядзець іх гульню.**

— Так, універсітэцкі баскетбол займае трывалыя пазіцыі. У нас ёсць нямала добрых спартсменак. Галіна Савіцкая, студэнтка II курса журфака, капітан «Гарызонта», член зборнай СССР. Упэўнена замацавалася ў асноўным саставе каманды майстроў Алена Дадычына (юрфак, II курс). Разам з імі выходзіць на пляцоўку першакурсніца хімфака Кацярына Рубан. У дублюючым саставе «Гарызонта» гуляе Алена Сяверчанка (мехмат, II курс). Яе аднакурсніца Ірына Дамарацкая выступае за гомельскі «Сож».

**— Віталь Ярвандавіч, баскетбалісткі універсітэта заўсёды крочылі ў ліку лідэраў студэнцкага баскетбола рэспублікі. І мінулы год гэта пацвердзіў.**

— У мінулым годзе дзяўчаты сталі чэмпіёнкамі горада, занялі на першынстве Белсавета ДСТ «Буравеснік» другое месца, услед за інстытутам фізкультуры, камандзе якога прайгралі толькі ў дадатковай пяціхвілінуцы. А восенню перамаглі на спаборніцтвах абласнога савета.

І ўсё ж галоўным экзаменам з'явіўся чэмпіянат БССР, які праходзіў пасля двухгадовага перапынку. Чацвёртае месца можна расцэньваць па-рознаму. Тут трэба мець на ўвазе тое, што універсітэцкая каманда позна ўключылася ў барацьбу за медалі.

У 1979 годзе нашы баскетбалісткі станавіліся чэмпіёнкамі рэспублікі. Сёлета не ўдалося. Першае месца заняла каманда ІФК, якая мела два паражэнні. На другім месцы — віцебскі «Спартак», бронзавыя прызёры —бабруйскі «Фермаш». Мы — чацвёртыя, далей ідуць калектывы Гродна, зборнай школьніц рэспублікі, Гомеля, Брэста.

Каманда пачала гуляць з другога тура замест каманды Мінскай вобласці, якая адмовілася ад выступлення. У баскетболе за перамогу налічваецца 2 ачкі, за паражэнне — 1 ачко. Такім чынам, калі б мы і прайгралі ўсе матчы першага тура, то апынуліся б не ніжэй трэцяга месца.

Баскетбалісткі правялі адзінаццаць гульняў: дзесяць перамог і адно паражэнне. Спачатку гулялі ў Мастах, дзе атрымалі верх над Віцебскай, Гомельскай, Брэсцкай камандамі і зборнай школьніц. Затым у спартыўнай зале ІФК выйгралі ў калектываў Гродна і Бабруйска і ўступілі восем ачкоў гаспадарам. Рашэннем аддзела баскетбола Спорткамітэта БССР да тура не былі допушчаны А. Дадычына і Л. Таўстыка (ІФК). Не пайшла гульня, хоць да гэтага не раз перамагалі інстытут фізкультуры. На фінішы чэмпіяната атрымалі чатыры перамогі над першымі саперніцамі.

Увесь час мы гулялі няпоўным саставам. За каманду не магла выступаць Г. Савіцкая. У Гомель не прыехалі А. Дадычына і А. Сяверчанка. Па розных прычынах не выходзіла на пляцоўку К. Рубан. Без яе прыходзілася цяжкавата. Каця — цэнтравы ігрок (рост — 191 см).

Удала разыгрывала мяч Лена Дадычына. Калі яе не было, выходзілі Іра Маскалёва (геафак) або Аксана Чарнова (мехмат). Вольга Кантор (ФПМ), якая гуляла на задняй лініі, выдатна выдатна справілася са сваімі абавязкамі. Добра папрацавала ў абароне Лена Сяверчанка, рэзультатыўна гулялі Іра Дамарацкая і Іра Фурына (хімфак). Грамятнасцю вызначаліся дзеяні Аксаны Пугачовай (гістфак), Алы Лаўшук (хімфак), Тані Ігнацьевай (ФПМ) і выпускніцы фізфака Марыны Хадкевіч.

Большасць баскетбалістак займаецца на малодшых курсах, што дае нам падставу глядзець у будучае з аптымізмам.

**— Чаго не скажаш аб хлопцах. Чым можна растлумачыць іх не вельмі ўдалыя выступленні?**

— Перш за ўсё — кепскім падборам ігракоў. Добрых спартсменаў паступае мала. А тыя, хто някепска гуляе, чамусьці губляюць інтарэс да вучобы, яны падводзяць і сябе, і калектыў. Мы заўсёды займалі высокія месцы: на першынствах абласавета і Белсавета былі трэцімі пасля ІФК і БПІ. Асноўную нагрузку нясуць выкладчыкі: майстар спорту Анатоль Парфіяновіч (кафедра фізвыхавання і спорту), Аляксандр Коўзік (гістфак) і Сяргей Барадзіч (ФПМ). Надрэнна гуляюць студэнты мехмата Павел Барысюк і Валера Рачок. Па новаму палажэнню да спаборніцтваў не будуць допускацца супрацоўнікі. Гэта ўскладняе становішча. Аднак здавацца не збіраемся.

**— Даўно наспела неабходнасць расшырыць спартыўныя секцыі. Цяпер, каб трапіць сюды, неабходна мець першы разрад. У баку застаюцца многія перспектыўныя баскетбалісты.**

— Гэта некалькі дапамагло б. Але расшырыць іх цяпер немагчыма. Справа ў тым, што баскетбол ва універсітэце курырую адзін я. Працы шмат, і проста не хапае часу праводзіць заняткі з другой групай. А допускаць іх да трэніровак з членамі зборнай нельга — за ўсімі не дагледзіш. На факультэтах ёсць баскетбольныя секцыі, але карысці ад іх мала.

**— Гэта яскрава прадэманстравалі першынствы універсітэта сярод супрацоўнікаў і студэнтаў. Мала добрых спартсменаў адкрылі яны.**

— Як правіла, вызначыліся тыя каманды, у якіх гулялі члены зборных. У супрацоўнікаў— ФПМ, у студэнтаў — фізфак, мехмат, ФПМ (хлопцы) і мехмат, геафак, журфак, хімфак, юрфак (дзяўчаты). Даволі лёгка дасталіся ім перамогі.

**— Пакуль на факультэтах не будуць удзяляць ўвагі секцыям, то масавасць будзе заставацца на паперы, а толку ад гэтага мала. І яшчэ б аднаго трэнера па баскетболу... Думаецца, што кафедра фізвыхавання і спорту павінна рашыць пытанне. Але давайце вернемся да зборных каманд. Як яны рыхтуюцца да новых стартаў?**

— Трэніруемся звычайна па пяць разоў у тыдзень. Па некалькі разоў штогод праводзім зборы, тады трэніроўкі праходзяць штодзённа.

У заключэнне заўсёды гавораць аб планах, ці не так? Ставім высокія задачы. Калі выкарыстаць усе рэзервы, то поспех прыйдзе. Хутка пачнецца чэмпіянат горада, дзе зноў будзе праверана баявітасць каманд.



# НА ЛЫЖНЫХ ТРАСАХ

У РАЎБІЧАХ завяршылася спартакіяда ВНУ рэспублікі па лыжных гонках. Чатыры дні мацнейшыя лыжнікі каманд вялі спрэчку за ўзнагароды. Універсітэцкая каманда пасля доўгага перапынку заняла трэцяе месца.

Асабліва паспяхова выступіў жаночы састаў. У гэтым годзе ён атрымаў добрае папаўненне: першакурсніцы А. Чэпек, А. Баркова (гістфак), А. Капылова (юрфак), А. Лукашэвіч (мехмат) ні ў чым не ўступаюць старшакурсніцам.

На жаль, нас напаткалі непрыемныя нечаканасці. З-за хваробы не змог выступаць у гэтым сезоне Дзіма Семчанка, Лене Чэпек перад спаборніцтвамі зрабілі аперацыю. Але каманда настроілася па-баявому.

Пасля першага дня лідэрства захапіла каманда інстытута фізкультуры, якая выступала ў другой групе. Мы займалі чацвёрты радок. Удала прабеглі спартсмены эстафеты 4×5 км і 4×10 км. Самым паспяховым аказаўся апошні дзень. Пачаўся ён трывожна — затрымаўся аўтобус. Але да старта паспелі, праўда, Л. Барковай прыйшлося стартаваць ледзь не з аўтобуса. І яна зрабіла добрую запеўку, паказаўшы шосты вынік у гонках на 3 км. Яе падтрымалі С. Сяргеева і Л. Капылова — у іх чацвёрты і пяты вынік сярод юніёрак. Усё залежала ад хлопцаў. Фінішуюць А. Таргонскі, В. Тутаў, Ю. Татульчанкоў... Усе сілы аддадзены барацьбе.

Задаволена трэнер Людміла Аляксееўна Капылова — у каманды агульнае трэцяе месца. Цяпер лыжнікі рыхтуюцца да першынства абласнога савета ДСТ «Буравеснік» і першынства універсітэта, якое павінна адбыцца 27—28 лютага.

**А. ДАНІЛЬЧАНКА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

## ● ПАД ВОСТРЫМ ВУГЛОМ ●

# ЗГУБІЛІСЯ... СПАРТСМЕНЫ

СПАРТАКІЯДА універсітэта набрала тэмп. Праведзены спаборніцтвы па класічнай барацьбе, дзю-до, баскетболу, валейболу. І дзіўныя малюнкі можна было назіраць на спаборніцтвах. Размінаюцца валейбалісты, баскетбалісты, пара ўжо пачынаць гульню, а саппернікаў няма. Напалавіну абрадаваныя (выйгрыш запісаны), напалавіну расчараваныя (толькі час марнавалі), спартсмены накіроўваюцца дамоў.

Трэба паважаць сябе, быць дысцыплінаваным і настойлівым. Трэба паважаць сапернікаў, не аддаваць перамогу ім без бою, калі ты слабейшы. А то прайгралі баскетбалісткі біяфака першыя матчы — і больш іх ніхто не бачыў на пляцоўцы. У турніры па валейболу ў апошні дзень было праведзена ўсяго дзве сустрэчы, астатнія так і не пачыналіся, бо паяўлялася толькі адна каманда. Чым можна растлумачыць такое? Безадказнасцю!

Ды каб няяўкі здараліся толькі ў слабых каманд. Але і ў некаторых калектывах, што выступалі ў мацнейшых групах, дысцыпліна кульгала на абедзве нагі. У мінулым годзе, напрыклад, хлопцы юрфака сталі чэмпіёнамі універсітэта па баскетболу. Сёлета ім па сілах было змагацца за прызавое месца. Няяўка ж адкінула іх на чацвёрты радок. Валейбалісткі юрфака ўвогуле не паяўляліся ў зале. Прыйдзецца выступаць ім у слабейшай групе.

Паміж баскетбалісткамі мехмата і журфака павінна была разгарнуцца барацьба за перамогу. Але гэтага не атрымалася. Спартсменкі мехмата выдатна правялі гульні, а журфак з-за недысцыплінаванасці асобных ігракоў заняў толькі трэцяе месца.

Можна назваць яшчэ каманды філфака, гістфака, біяфака. Насупраць іх стаяць тлустыя нулі з-за няяўкі.

На матч з юрфакам баскетбалісткі філфака прыйшлі толькі ўчатырох. Ім залічылі паражэнне, і толькі тады ў зале паявілася пятая спартсменка. Калі ж намеснік дэкана па фізвыхаванню і спорту зрабіла ёй слушную заўвагу (і ўсяго), то яна бурна адрэагавала, а сяброўка падбадзёрыла: «Не хвалюйся, не прымай да сэрца, плюй на ўсё!».

Удумайцеся ў словы! Іх гавораць будучы педагог, чалавек, прафесія якога — выхоўваць людзей. З яго дзеці будуць браць прыклад...

Наспеў час для таго, каб спортбюро і грамадскія арганізацыі факультэтаў разабраліся з узнікшым становішчам.

**І. УЛАДЗІМІРАЎ.**



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
АТ 10064. Зак. 281.

16 лютага 1984 г.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ